**Калектыўны творчы праект клуба старшакласнікаў «Грамадзянін» «Мая будучая прафесія»**

**А. М. Сулімаў,**
педагог сацыяльны катэгорыі
**М. А. Сулімава,**
настаўнік гісторыі вышэйшай катэгорыі

Патрыятызм – гэта пачуццё любові да Радзімы, якое праяўляецца ў актыўнай дзейнасці па яе росквіту і абароне каштоўнасцей. Выхаванне патрыятызму з'яўляецца важнай задачай сучаснай школы і патрабуе паважлівых адносін да гісторыі дзяржавы, герояў і вядомых людзей краіны, дасканалага вывучэння роднага мастацкага слова. Менавіта грамадзянска-патрыятычнае выхаванне стала асновай дзейнасці клуба «Грамадзянін», створанага па ініцыятыве адміністрацыі школы, настаўнікаў, старшакласнікаў у 2003 годзе. Работа клуба накіравана на выхаванне асобы, якая ўсведамляе патрэбнасць і неабходнасць служэння свайму народу; чалавека, упэўненага ў важнасці актыўнага ўдзелу ў працоўнай і грамадскай дзейнасці; высокадухоўнай асобы. Асноўнай формай работы клуба з’яўляецца *калектыўная работа*: добраўпарадкаванне і азеляненне памяшканняў і тэрыторыі школы, мікрараёна; масавыя мерапрыемствы і святы; канферэнцыі.

Члены клуба праяўляюць цікавасць да навукова-даследчай працы. На школьных і раённых навукова-практычных канферэнцыях былі прадстаўлены работы: «Архіў Празароцкай царквы», «Міжканфесійныя адносіны ў пачатку XX стагоддзя (на прыкладзе мястэчка Празарокі) ».

Дзейнасць клуба заснавана на рабоце *малых груп*:

- ✓ *часовыя групы.* Яны ствараюцца для падрыхтоўкі і рэалізацыі пэўнага калектыўнага творчага праекта. Напрыклад, пры падрыхтоўцы праекта «Права на адукацыю» члены клуба працавалі ў групах па тэмах: а) Адукацыя ў Беларусі; б) адукацыя ў Германіі; в) адукацыя ў Італіі; г) адукацыя ў ЗША.

✓ *пастаяныя групы.* Такіх груп у дзейнасці клуба звычайна тры. Першая «Сацыёлагі» – праводзяць тэматычныя сацыялагічныя даследаванні; другая «Журналісты» выпускаюць «баявыя лісткі» з вынікамі працы на пэўным этапе рэалізацыі праекта, трымаюць на пастаянным кантролі сувязь з грамадскасцю – вучнямі школы, настаўнікамі, бацькамі; трэцяя «Аналітыкі» – вывучаюць родныя аспекты праблемы, складаюць выніковыя прэзентацыі.

*Алгарытм праектнай дзейнасці:*

1. Выбар праблемы, абгрунтаванне практычнай значнасці яе выніку.

2. Фармуляваеек мэты і паэтапных задач.

3. Вызначэнне маштабаў работы, сродкаў і метадаў дасягнення мэты, меркаваныя складанасці, тэрміны, падзел працы на этапы.

4. Размеркаванне абавязкаў на кожным з этапаў праекта пры ўсеагульным раўнапраўі. Матывацыя ўдзельнікаў.

5. Планаванне агульнай мадэлі і структуры праекта.

6. Прэзентацыя вынікаў работы.

Кожны год адзін з праектаў прысвечаны прафарыентацыйнай рабоце, праблеме паспяховай сацыялізацыі выпускніка, сітуацыі на рынку працы вобласці і раёна, прэстыжу прафесіі. Прапануем вашай увазе **алгарытм дзейнасці па рэалізацыі калектыўнага творчага праекта «Мая будучая прафесія»**.

**Мэта:** абагульненне і замацаванне ведаў аб сучасных прафесіях у Беларусі, фарміраванне сацыяльнай паспяховасці навучэнцаў.

**Задачы:**

- выхоўваць пачуццё павагі да чалавека працы;
- вызначыць прафесіі, запатрабаваныя на сучасным рынку працы, садзейнічаць самавызначэнню навучэнцаў, іх паспяховай сацыялізацыі ў грамадстве;
- развіваць камунікатыўныя здольнасці навучэнцаў у працэсе падрыхтоўкі праекта, фарміраваць уменне аргументаваць сваю думку і працаваць з рознымі крыніцамі інфармацыі.

**Абсталяванне:** літаратура па тэме «Прафесіі сучаснай Беларусі», камп’ютар, мультымедыяпраектар для паказу прэзентацый, выстава рэпрадукцый карцін і фотаздымкаў на тэму «Чалавек працы».

## Ход работы над праектам

**І. Пачатковы этап**

Распрацоўваюцца асноўныя ідэі рэалізацыі праекта. Вызначаецца стан вывучанасці пытання, ідзе збор матэрыяоу па вызначанай тэме, абаснаванне актуальнасці тэмы. Выбіраюцца кіраўнікі для рэалізацыі пэўных напрамкаў, размяркоўваюцца абавязкі кожнага ўдзельніка праекта.

**ІІ. Этап распрацоўкі праекта**

Плануюцца работы творчых груп.

1. «Журналісты» сустракаюцца з прадстаўнікамі розных прафесій, абмяркоўваюць з імі якасці характару і веды, неабходныя для атрымання прафесіі; у якой установе атрымалі прафесійную падрыхтоўку.

2. «Сацыёлагі» – распрацоўваюць анкету і праводзяць анкетаванне сярод вучняў 5–11 класаў.

3. «Аналітыкі» – выкарыстоўваюць інтэрнэт-рэсурсы, рыхтуюць прэзентацыі прафесій для навучэнцаў школы.

**ІІІ. Этап рэалізацыі праекта**

1. Збор усёй інфармацыі з улікам тэмы і мэты праекта. Падрыхтоўка і распрацоўка аўдыё- і відэазместу праекта.

2. Кантроль і карэкцыя атрыманых вынікаў.

3. Каардынацыя дзейнасці трох груп.

**IV. Этап завяршэння праекта**

На адкрытым пасяджэнніі сумесна з заняткам факультатыва «Маё прафесійнае будучае» члены клуба «Грамадзянін» пазнаёмілі ўсіх навучэнцаў 5–11 класаў з вынікамі работы.

Кіраўнік клуба «Грамадзянін» акцэнтаваў увагу на мэце праекта: выхаванне адукаваных, высокакваліфікаваных спецыялістаў.

Вынікі даследавання групы «Сацыёлагі» наступныя. Мы размярквалі прафесіі па рэйтынгавай шкале: чым часцей іх называлі, тым вышэй іх рэйтынг.

1. Якія прафесіі вам падабаюцца?

*Дзяўчынкі:* урач, настаўнік, выхавацель, фармацэўт, ветурач, медсястра, журналіст, праваднік, повар, перакладчык, дыпламат¸ акцёр, філолаг, адвакат, дызайнер, эканаміст, біёлаг, хімік, прадавец, кандытар.

*Хлопчыкі:* вадзіцель, будаўнік, зваршчык, электрык, археолаг, праграміст, праваднік, урач, ветурач, настаўнік, святар, механік, повар, біёлаг, трактарыст, машыніст, менеджар, мастак.

2. Па якой прычыне вам падабаюцца гэтыя прафесіі? Чаму вы выбралі менавіта такую прафесію?

*Вучні 5–8 класаў:* дапамога людзям, высокая заработная плата, магчымасць лячыць людзей, люблю працаваць з дзецьмі, змагу атрымаць неабходную адукацыю, люблю лячыць жывёл, люблю займацца тэхнікай, матэрыяльная забяспечанасць, магчымасць наведаць розныя краіны.

*Вучні 9–11 класаў:* магчымасць для самаразвіцця, дапамога людзям, люблю працаваць з дзецьмі, люблю займацца тэхнікай, высокая заработная плата, жыццё ў горадзе.

3. Ваша будучая прафесія.

Урач, настаўнік, праваднік, вадзіцель, ветурач, выхавацель, перакладчык, медсястра, будаўнік, зваршчык, святар, міліцыянер, юрыст, машыніст, прадавец, повар, слесар, праграміст, эканаміст, хімік–тэхнолаг, фармацэўт.

4. Праца – гэта права ці абавязак?

Большасць навучэнцаў адказалі, што праца – гэта і права, і абавязак кожнага грамадзяніна нашай краіны.

Настаўнік знаёміць вучняў з новымі прафесіямі: рыэлтар, дзі-джэй, вэб-дызайнер, менеджар па рэкламе, рэкруцёр, спецыяліст ц сферы эканомікі і фінансаў, спецыяліст банкаўскай сферы, спецыяліст бухгалтарскай сферы, спецыяліст аўдытарскай фірмы, дызайнер.

«Журналісты» і «аналітыкі» вынікі сваёй работы прадставілі ў форме мультымедыйных прэзентацый аб прафесіях пажарнага, дыпламата, тэолага, перакладчыка, электрыка, будаўніка, праваднiка, фармацэўта, фатографа.

Ідзе абмеркаванне навучэнцамі важнасці прадстаўленых прафесій.

У канцы мерапрыемства кіраўнік групы «аналітыкаў» падводзіць вынік важнасці ўсіх прафесій для грамадства – «Выбар і будучыня – за намі».

## Літаратура


1. **Кодекс Республики Беларусь об образовании** // Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь. – 2011. – №3–2/1795.
2. **Буткевич, В. В.** Методика организации гражданского воспитания учащихся: пособие для педагогов учреждений общ. сред. образования / В. В. Буткевич, О. В.Толкачёва. – Минск: Нац. ин-т образования, 2011. – 224 с.
3. **Буткевич, В. В.** Патриотическое воспитание учащихся: история и современность: пособие для педагогов общеобразоват. учреждений, учреждений внешкольного воспитания и обучения / В. В. Буткевич. – Минск: Нац. ин-т образования, 2010. – 208 с.
4. **Проектная технология** // Гісторыя: праблемы выкладання. – 2009. – №5. – С. 61–63.